# ЗАДАННІ
## Завочнага індывідуальнага тура

**Удзельнікі павінны прадставіць у Арганізацыйны камітэт два эсэ па ўстаноўленай форме, з якіх:**
**а) адно эсэ рыхтуецца на тэму, прапанаваную раздзелам "Тэорыя і гісторыя права і дзяржавы", тэматыка другога эсэ выбіраецца ўдзельнікам самастойна;**
**б) адно эсэ па любой намінацыі, уключаючы і факультатыўны конкурс, прадстаўляецца на беларускай мове (дадатковае заданне на веданне беларускай прафесійнай юрыдычнай лексікі).**

## 1. ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА

Фактары, якія забяспечваюць суверэнітэт дзяржавы

Юрыдычная прырода Мытнага кодэкса Мытнага Саюза і яго месца ў сістэме нацыянальных крыніц права

Эпоха Адраджэння і яе адлюстраванне ў нацыянальным праве (да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання)

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР: тэндэнцыі развіцця

## 2. КАНСТЫТУЦЫЙНАЕ ПРАВА, АДМІНІСТРАЦЫЙНАЕ ПРАВА

Межы ажыццяўлення праў чалавека

Павышэнне эфектыўнасці сістэмы органаў выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь

Крытэрыі фарміравання сістэмы адміністрацыйных спагнанняў за адміністрацыйныя правапарушэнні

Адміністрацыйная прэвенцыя: паняцце і сутнасць

## 3. ГРАМАДЗЯНСКАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС, ГАСПАДАРЧАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС

Праблемы класіфікацыі прыватна-прававых дагавораў

Перадачы арганізацыі эфірнага або кабельнага вяшчання як аб'ект сумежных праў

Выканаўчае вядзенне ў сістэме грамадзянскага працэсу

Перспектывы кадыфікацыі нацыянальнага грамадзянска-працэсуальнага права

## 4. КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА І ПРАЦЭС

Крыміналагічныя аспекты ўстанаўлення крымінальнай адказнасці за незаконны абарот наркатычных рэчываў, псіхатропных сродкаў, іх прэкурсораў і аналагаў

Каштоўнасна-светапоглядныя падставы сістэмы крымінальных пакаранняў

Удасканаленне крымінальнага працэсу ў кантэксце развіцця інфармацыйных тэхналогій

Межы працэсуальнай самастойнасці следчага ва ўмовах ажыццяўлення працэсуальнага кантролю і пракурорскага нагляду

## 5. ЭКАЛАГІЧНАЕ ПРАВА, ЗЯМЕЛЬНАЕ ПРАВА

Прававыя механізмы аховы навакольнага асяроддзя на стадыі планавання гаспадарчай дзейнасці

Права лесакарыстання ў свеце новага ляснога заканадаўства Рэспублікі Беларусь

## 6. КОНКУРС ПА НАТАРЫЯТУ І НАТАРЫЯЛЬНАМУ ПРАВУ

**(факультатыўны конкурс, аднак кожная ўстанова вышэйшай адукацыі абавязана прыняць удзел у конкурсе з разліку не менш за адну асобу на кожныя пяць удзельнікаў індывідуальнага заліку)**

Доказная сіла натарыяльнага акта

Тэрміны і спосабы прыняцця спадчыны